ДУХОЎНАСЦЬ



# ПАЦЯРПЕЛЫЯ ЗА ВЕРУ

Нядаўна ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага адбылася прэзентацыя кнігі аспіранта кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Аляксандра Горнага “Сінодзік пацярпелых за веру і Царкву Хрыстовую ў Гродзенскай епархіі (XX стагоддзе)”.

Выданне склалі жыццяпісы 91 свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеля Гродзенскай епархіі, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій у Савецкім Саюзе, былі забіты нямецка-фашысцкімі захопнікамі на акупіраваных тэрыторыях, праследаваліся польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі. Акрамя біяграфічных дадзеных прадстаўлены ўспаміны, дакументальныя матэрыялы і газетныя карэспандэнцыі, якія сведчаць пра пакутніцкі лёс духавенства і свецкіх людзей у XX стагоддзі.

Матэрыялы для сваёй кнігі А. Горны збіраў два гады ў бібліятэках і архівах Беларусі і Літвы. Кніга выдадзена па благаславенні архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага Арцемія і рэкамендавана да публікацыі Выдавецкім саветам Беларускай Праваслаўнай Царквы. Гэта выданне будзе цікава прафесійным гісторыкам, краязнаўцам, прыходскім святарам, усім, хто цікавіцца канфесійнай гісторыяй Беларусі.

На прэзентацыі выступілі сам аўтар, гродзенскі благачынны протаіерэй Аляксандр Велісейчык, дырэктар выдавецтва ЮрСаПрынт Аляксандр Рыжы. Кніга выклікала вялікую цікавасць у прысутных прадстаўнікоў духавенства, выкладчыкаў і студэнтаў факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму, прэсы. Аўтару былі зададзены шматлікія пытанні. Адбылося зацікаўленае абмеркаванне яго кнігі.

Інфармацыя пра выхад у свет гэтага выдання таксама была размешчана на інтэрнэт-парталах Беларускай Праваслаўнай Царквы, Выдавецкага савета Рускай Праваслаўнай Царквы, Мінскіх духоўных школ.

**Святлана МАРОЗАВА,**
**прафесар,**
**доктар гістарычных навук.**